# СЯРЭДНЯВЕЧНЫЯ ФРАНЦЫСКАНЦЫ. ПОГЛЯД ЗВОНКУ

**А.А. Рахоўская**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*elenarahovskaya99@mail.ru;*
*навук. кір. – І. А Еўтухоў, канд. гіст. навук, праф.*

У артыкуле аўтар разглядае францысканскі ордэн XIII–XV стст. з пазіцыяў вонкавых назіральнікаў (як клірыкаў, так і свецкіх) на падставе шматлікіх наратыўных крыніц па-за францысканскага паходжання (хронікі, лісты, рэлігійная літаратура, зборнікі навэл і фацэцый), якія раней не выкарыстоўваліся з гэтай мэтай. А менавіта такім чынам можна, па-першае, ацаніць уплыў ордэна на грамадства, па-другое, прасачыць эвалюцыю гэтага ўплыву. Рэканструюецца абагульнены вобраз францысканскага манаха ва ўяўленні сярэднявечнага еўрапейскаага грамадства, адлюстроўваюцца яскравыя змены ва ўспрыняцці францысканцаў XIV–XV стст. у параўнанні з адносінамі да манахаў гэтага ордэна ў XIII ст. Робіцца выснова аб дваістасці стаўлення грамадства да францысканцаў, вылучаюцца асноўныя напрамкі крытыкі і ўсхвалення ордэна.

***Ключавыя словы:*** Францысканскі ордэн, манаства, ацэнка сучаснікамі, наратыўныя крыніцы, вобраз у літаратуры.

Францысканскі жабрацкі рух быў распачаты Францыскам Асізскім у пачатку XIII ст., а ў 1223 г. яго ордэн атрымаў Статут і быў афіцыйна зацвержаны папам Рымскім пад назвай ордэн братоў меншых – мінарытаў. Рух і яго заснавальнік вельмі хутка сталі знакамітымі ў Еўропе, і шмат хто не застаўся абыякавым да гэтай новай з'явы. У шматлікіх крыніцах не францысканскага паходжання клірыкі, манахі іншых ордэнаў і свецкія асобы пакінулі свой погляд на францысканскіх манахаў.

Адныя з першых сведчанняў аб францысканскім руху з'яўляюцца ў лістах Жака дэ Вітры (каля 1180–1240 гг.), манаха-аўгусцінца, які быў прызначаны біскупам Акры. Квінтэсенцыяй выражэння стаўлення Жака дэ Вітры да ранніх францысканцаў з'яўляюцца апошнія словы дадзенага ліста: «Я веру, што Гасподзь жадае выратаваць шмат душ да канца свету праз такіх простых і бедных людзей» [1, p. 578-580].

Наступная ўзгадка пра францысканцаў у лісце Жака дэ Вітры з'яўляецца праз чатыры гады. Зараз дэ Вітры ўжо не так слепа захапляецца ордэнам францысканцаў. Ён выказвае занепакоенасць тым, што, на яго думку, гэты ордэн зашмат рызыкуе, калі «рассылае па ўсім свеце па двое не толькі рэлігійна сфармаваных, але і маладых людзей, якім трэба было б спачатку прайсці выпрабаванне і пазнаць манастырскую дысцыпліну». Для дэманстрацыі падтрымкі вышэйшымі каталіцкімі коламі Францысканскага ордэна паказальна тое, што гэтыя

крытычныя заўвагі не трапілі ў варыянт ліста, які быў дасланы папе Рымскаму [1, p. 580-581].

Англійскі манах-бенедыктынец Роджэр Вендаверскі (памёр у 1236 г.) у хроніцы «Кветкі гісторыі» паказвае францысканскі рух як хутка набіраючы папулярнасць рух прапаведнікаў, падкрэслівае глыбіню беднасці і пакорлівасці манахаў [1, p. 597-599]. Нарбертанец Бурхард з Урсберга ў апісанні францысканцаў акцэнтуе ўвагу на іх галоўным адрозненні ад ерэтычных суполак, што было немалаважна ў часы панавання на поўдні Францыі катараў [1, p. 593-594].

Францысканцы фігуруюць у некалькіх эпізодах «Гісторыі арцыбіскупаў Салоны і Спліта» Фамы Спліцкага (каля 1200–1268 гг.). Фама паказвае поспех францысканскай пропаведзі, вялікую папулярнасць Францыска Асізскага і ўзвялічванне яго святасці яшчэ пры жыцці, а таксама вялікі ўплыў братоў-мінарытаў на палітычнае жыццё рэгіёна. Так, яны выступалі ў ролі пасланцоў да свецкіх кіраўнікоў, непасрэдна ўдзельнічылі ў абранні гарадскога падэсты і выбарах біскупаў [2, с. 127-128]. Яшчэ ў шматлікіх эпізодах падкрэсліваецца міралюбства францысканцаў, імкненне манахаў ордэна да спынення варожасці і войнаў.

У «Хроніцы, або дзеях англійскіх каралёў», складзенай аўгусцінцам Уолтарам з Хэмінбурга да 1346 г., францысканцы зноў прадстаўлены праз іх уплыў на палітычнае жыццё, а не праз апісанне іх духоўных якасцяў. Эпізадычныя ўзгадкі паказваюць мінарытаў набліжанымі да каралеўскага двара і пацвярджаюць значнасць іх палітычнай вагі [3, p. 318, 341].

Але стаўленне да францысканцаў не паўсюль і не ва ўсіх было адназначна станоўчым, як гэта магло паказацца. Так Банкампанья да Сінья (каля 1170 – пасля 1240 гг.), які з'яўляўся вядучым магістрам рыторыкі ў Балонскім універсітэце, пакінуў вельмі трапныя заўвагі, якія паказваюць дваістасць адносін насельніцтва да новага рэлігійнага руху. З аднаго боку Банкампанья прызнае ранніх францысканцаў за «паплечнікаў Госпада», з другога – ён кажа, што гэтыя юнакі і хлопцы «ўжо дайшлі да крайнасці вар'яцтва, бо блукаюць…, пераносячы жудасныя і нечалавечыя пакуты» [1, p. 590]. Манах-цыстарыянец Цэзарый Гейстэрбахскі паказаў недаверлівую пазіцыю царкоўнікаў адносна новых ордэнаў. Бо калі браты-мінарыты ўпершыню з'явіліся ў Кёльне, некаторыя прадстаўнікі духавенства былі вельмі жорсткімі з імі і нават пратэставалі супраць іх прысутнасці [1, p. 594-595].

У значна адрозным кантэксце прадставіў францысканцаў Мацвей Парыжскі (каля 1200–1259), бенедыктынскі манах, у сваёй аўтарскай частцы «Вялікай хронікі». Пачынаючы з запісаў 1230-х гг., мінарыты

часцяком прадстаўлены ў адмоўным святле праз іх сувязі з палітычнымі і фінансавымі справамі Рымскай курыі і каралёў, з продажам індульгенцый. Аўтар абураецца з-за падзення нораваў ордэна і яго ўзбагачэння. У асобную праблему выносіцца п'янства манахаў. У той жа час францысканцы выступаюць як бліжэйшыя і аўтарытэтнейшыя дарадцы свецкіх кіраўнікоў [4, р. 251, 287, 627].

Літаратура Позняга сярэднявечча, якая закранае францысканцаў, падзяляецца на дзве катэгорыі: палемічныя творы, напісаныя тэолагамі з мэтай тэарэтычнага супрацьстаяння жабрацкім ордэнам, і шырокі спектр забаўляльных твораў, якія акцэнтуюцца на выкрыванні крывадушнасці жабрацкіх ордэнаў.

У асноўным крытыкі-клірыкі ў сваіх трактатах выкарыстоўвалі тэрмін «манахі жабрацкіх ордэнаў», зрэдку ўдакладняючы якіх канкрэтна. Аднак часцей за ўсё яны мелі на ўвазе францысканцаў, бо іх колькасна было больш за ўсіх. Можна вылучыць пяць пазіцый, па якіх ішла крытыка жабрацкіх ордэнаў: 1) празмерная колькасць манахаў 2) іх падман і крывадушнасць 3) іх злоўжыванне зарокам беднасці 4) набыццё імі прывілеяў свецкіх чыноўнікаў 5) грубае стаўленне адзін да аднаго [5, р. 111].

Англійскі святар Джон Укліф і ірландскі арцыбіскуп Рычард ФіцРальф пісалі, што манахаў стала залішне шмат, крытыкавалі распусныя паводзіны францысканцаў, папракалі манахаў і тым, што яны імкнуліся здабыць пратэкцыю багацеяў, шукалі пасадаў пры дварах арыстакратаў, умешваліся ў справы свецкіх судоў і не звярталі ўвагі на бедных прыхажан [5, р. 111-113, 127-129].

Яскравым прыкладам новай свецкай гісторыі з'яўляецца «Новая хроніка, або гісторыя Фларэнцыі», напісаная сям'ёй Вілані паміж 1300 і 1348 гг. Вобраз францысканцаў у «Хроніцы…» неадназначны: адныя распачынаюць несумленныя акцыі, іншыя «знакаміты сваёй святасцю і беззаганным жыццём». Аднак не выклікае сумніву іх высокае становішча сярод царкоўных і палітычных эліт [6, с. 182, 235]. Больш за тое хроніка Вілані паказвае, які вялікі ўплыў маюць францысканцы пры папскім двары. Так, адзін дваранін дзеля таго, каб трапіць да папы Мікалая ІІІ, пераапрануўся менавіта францысканскім манахам, а не якім-небудзь іншым, што сведчыць пра асаблівую набліжанасць братоў гэтага ордэна да пантыфіка [6, с. 213]. Такім чынам, сярод мінарытаў мы назіраем зусім розных па сваіх маральных якасцях братоў, але ёсць момант, які іх аб'ядноўвае, – гэта ўдзел «разумных і хітрых» францысканцаў (заўважым, што ўжо не «пакорных і простых», як то было ў ранейшых крыніцах) у палітычным жыцці рэгіёна на самым вышэйшым узроўні.

Вялікую групу літаратурных крыніц XIV–XV стст. складаюць забаўляльныя творы – фацэцыі і навелы. Аднак пры працы з гэтым відам крыніц трэба ўлічваць, што аўтары забаўляльнай літаратуры былі абмежаваны патрабаваннямі сатыры, і таму іх не цікавілі пазітыўныя паведамленні пра манахаў. Напрыклад, пра місіі ў Кітай, Індыю, Боснію ці пра гераізм манахаў, якія клапаціліся аб хворых падчас Чорнай смерці. Звесткі аўтараў навэл і фацэцый у агульным не пазбаўлены дакладнасці, аднак дзеля дабаўлення рэзананса сваім гісторыям яны выкарыстоўвалі перабольшванні.

У знакамітым «Дэкамероне» Джавані Бакачыа францысканцы толькі прыкідваюцца праведнікамі, а на самай справе з'яўляюцца падманшчыкамі, крывадушнікамі, дармаедамі, парушыцелямі ўсялякіх зарокаў [7, 47-49, 246-254]. У зборніку фацэцый Поджа Брачаліні францысканцы прадстаўлены як дакучлівыя нахабнікі, як сварлівыя і недалёкія людзі, якія нават паміж сабой не могуць дамовіцца. Гэты сюжэт можна разглядаць як алюзію на пастаянныя спрэчкі ўнутрыордэнскіх груповак па пытаннях строгасці выконвання заветаў Францыска і іх трактовак [8, с. 103]. У Брачаліні знайшлося і адлюстраванне распусных адносін францысканцаў з жанчынамі.

Мазучыа Салернітанец (каля 1410–1475 гг.) у зборніку «Навеліна» выкрывае заганы францысканцаў, як і іншых манахаў. Аднак прызнае за францысканцамі асобныя таленты і станоўчыя якасці. Францысканцы апісваюцца як знатакі філасофіі, паспяховыя ўніверсітэцкі магістары. Адначасова аўтар ужо звыкла крытыкуе іх за тое, што выкладаюць яны «за немалую ўзнагароду», а чытаюць пропаведзі «з неабходнасці або выгады», а не па сапраўднай набожнасці. У Мазучыя таксама прасочваецца яшчэ адна загана, якую крытыкі класічна прыпісваюць францысканцам, – гэта прага да багацця. Са сціслых паведамленняў «Навеліна» можна вылучыць абрысы ўзаемаадносін паміж братамі манастыра. Францысканскія канвенты поўняцца інтрыгамі і змовамі да такой ступені, што манахі здольныя прычыніць адзін аднаму фізічную шкоду. У той жа час са зборніку Мазучыа вынікае, што францысканскі ордэн застаецца масавым і ўплывовым. Нягледзячы на ўсе заганы мінарытаў, яны з'яўляюцца адукаванымі, годнымі прапаведнікамі, якія збіраюць вакол сябе натоўпы народу, «усюды праслаўляючыся і ўзбуджаючы да сябе пашану» [9, с. 21-25, 53, 105].

Такім чынам, адносіны грамадскасці да францысканцаў з самага пачатку былі дваістымі. У прыхільнікаў абнаўлення царквы новы ордэн выклікаў захапленне, у ім бачылі сілу, здольную перадухіліць секулярызацыю царквы і падзенне ўзроўню маральнасці духавенства, процівагу ерэтычным рухам. У той жа час кансерватыўныя колы

выказваліся з падазронасцю аб ордэне, бо ўсё ў ранніх францысканцаў было «занадта»: занадта бедныя, занадта актыўныя, занадта непадобныя на класічныя ордэны аўгусцінцаў і бенедыктынцаў. У крыніцах першай паловы XIII ст. акцэнт рабіўся перш за ўсё на раскрыцці духоўных якасцяў братоў-францысканцаў і адрозненняў іх лада жыцця ад папярэдніх ордэнаў і ад ерэтыкоў. З другой паловы XIII ст. аўтары адышлі ад апісання асабістых якасцяў мінарытаў і пачалі больш казаць аб сувязях францысканцаў з кіруючымі коламі і іх удзеле ў палітыцы.

З XIV ст. францысканцы сутыкнуліся з хваляй моцнай крытыкі, якая зыходзіла як ад духоўных асоб, так і ад свецкіх, пры чым закранала тыя сферы жыцця, за праведнасць у якіх усхвалялі францысканцаў XIII ст. Такім чынам, адбывалася схаванае параўнанне сучасных братоў з іх папярэднікамі.

Эвалюцыя ордэна францысканцаў знайшла адлюстраванне ў па-за ордэнскіх крыніцах. Так ва ўсіх разгледжаных творах першай паловы XIII ст. вакол францысканцаў найчасцей сустракаюцца словы «жабрацтва», «пакора», «прастата», «дабрадзейнасць», «выратаванне душ», а пачынаючы з другой паловы XIII ст., гэтыя словы змяняюцца на «карыслівасць», «ганарлівасць», «крывадушнасць», «несумленнасць», што сведчыць аб падзенні нораваў у ордэне. У крыніцах прасочваецца пераход ад успрыняцця францысканцаў як руху наіўных і адухоўленых праведнікаў да разгляду іх ордэна як уплывовага гульца ў палітычнай і духоўнай сферах жыцця Еўропы.

**Бібліяграфічныя спасылкі:**


1. Francis of Assisi: early documents / edited by Regis J. Armstrong, J. Wayne Hellmann, William J. Short. – New York, London, Manila: New City Press, 1999. – Vol. I : The Saint. – 624 p.
2. Фома Сплитский История архиепископов Салоны и Сплита / пер., комм. О. А. Акимовой. – М.: «Индрик», 1997. – 320 с.
3. Walteri de Hemingburgh Chronicon domini: vulgo Hemingford nuncupati ... de gestis regum Angliæ: in 2 vol. / edited by Hans Claude Hamilton. – London, 1848. – Vol. 1. – 374 p.
4. Matthæi Parisiensis, Monachi Sancti Albani Chronica Majora: in 7 vol. / edited by Henry Richards Luard. – London: Longman & Company, 1876. – Vol. 3. – 706 p.
5. Erickson, C. The Fourteenth-Century Franciscans and their Critics / Carolly Erickson // Franciscan Studies. – 1975. – Vol. 35. – P. 107–135.
6. Виллани, Дж. Новая хроника, или История Флоренции / пер., ст. и примеч. М. А. Юсима. – М.: Наука, 1997. – 551 с.
7. Боккаччо, Дж. Декамерон / Джованни Боккаччо ; пер. с ит. А. Веселовского. – СПб. : Азбука, Азбука-Аттикус, 2017. – 640 с.
8. Браччолини, Поджо Фацеции / Пер. с лат. и вступ. статья А. Дживелегова. – М. : Худож. лит., 1984. – 167 с.

9. Мазуччо Гвардато Новеллино: Пер. с ит. / под общ. ред. А. Д. Михайловой. – М.: Республика, 1993. – 400 с.